1. Укажыце словазлучэнні, у якіх падкрэсленыя словы не маюць прыставак.

а)*наяўны разлік*
б)*разбіць нашчэнт*
в)*вострыя нажніцы*
г)*ненавісны вораг*
д)*прыгожая назва*
е)*нашэнне зброі*
ё)*народны паэт*
ж)*недаспелы яблык*
з)*цікавы нарыс*
і)*мінскі напуамак*
к)*перапісаць нанава*
л)*належны ўзровень*

2. Якія словы маюць невытворныя асновы?

а)*важны,* б)*работа,* в)*сямёра,* г) *абрыў,* д) *фармальны,* е) нерад, ё) *абруч,* ж) *затвор,* з) *пасцілка,* і) *аповесць,* к) *мурашка.*

3. Якія падкрэсленыя словы маюць вытворныя асновы?

а) *свежыя памідоры,* б) *песні-жальбы,* в) *родная прырода,* г) *вядомы унікум,* д) *чарнільная ручка,* е) *высокая лесвіца,* ё) *кропля расы,* ж) *раскласці пасьянс,* з) *чорны пісшалет,* і) *плата за праезд,* к) *сустрэліся летась,* л) *вясёлы ўнук*

4. Якое слова мае дзве прыстаўкі, корань, чатыры суфіксы і нулявы канчатак?

а) *адрэкамендавацца* г) *бязбоязна*
б) *вынаходніцтва* д) *неажыццявімасць*
в) *папавазіўся* е) *панахадзілася*

5.Аднакаранёвыя словы (1), словы з аманімічнымі каранямі (2), рознакаранёвыя словы (3). Пастаўце адпаведную лічбу і графічна абазначце карані.

*Застоліць — застольны* (...), *жаночасць — жаноцкасць* (...), *падручнік — наручнікі* (...), *запалёны — запалены* (...), *нарада — дарадчык* (...), *заможна — няможна* (...), *згарэў — прыгорак* (...), *жніўны — жнівеньскі* (...), *ношка - падносіць* (...), *вада — падводзіць* (...), *народ — адрадзіць* (...), *замок — замокнуць* (...).